ЗАЦВЕРДЖАНА

Пастанова
Міністэрства адукацыі
Рэспублікі Беларусь
01.03.2023 № 60

**Праграма карэкцыйных заняткаў «Сацыяльнае арыентаванне» для VI–XII класаў вучэбнага плана спецыяльнай школы, спецыяльнай школы-інтэрната для вучняў з цяжкасцямі ў навучанні з беларускай мовай навучання і выхавання**

## ГЛАВА 1
## АГУЛЬНЫЯ ПАЛАЖЭНННІ

1. Дадзеная праграма карэкцыйных заняткаў «Сацыяльнае арыентаванне» (далей – праграма) прызначана для VI–XII класаў устаноў адукацыі, якія рэалізуюць адукацыйную праграму спецыяльнай адукацыі на ўзроўні агульнай сярэдняй адукацыі, што стварылі ўмовы для навучання і выхавання вучняў з цяжкасцямі ў навучанні (далей – вучні).

2. Мэта – карэкцыя развіцця арыенціровачнай дзейнасці вучняў на матэрыяле з'яў (яўленняў) сацыяльнага жыцця і сацыяльных адносін.

3. Задачы:

актывізаваць пазнавальны інтарэс вучняў да навакольнага сацыяльнага свету і развіваць матывацыю да авалодання асноўнымі кампетэнцыямі сацыяльнага арыентавання;

садзейнічаць назапашванню вучнямі сацыяльнага вопыту;

фарміраваць у вучняў уменні актуалізаваць сацыяльны вопыт;

фарміраваць у вучняў уменні арыентавацца ў з'явах сацыяльнага жыцця, розных сацыяльных сітуацыях і на аснове гэтага вызначаць і рэалізоўваць змест сваёй сацыяльнай дзейнасці;

фарміраваць у вучняў імкненне да сацыяльнага ўзаемадзеяння і сацыяльна нарматыўных паводзін;

фарміраваць у вучняў сацыяльна-камунікатыўныя ўменні;

садзейнічаць самапазнанню і самарэалізацыі вучняў.

4. Змест дадзенай праграмы ўключае наступныя раздзелы:

грамадзянска-прававая кампетэнцыя;

кампетэнцыя здароўезберажэння;

сямейна-бытавая кампетэнцыя;

сацыякультурная кампетэнцыя;

кампетэнцыя прафесійнага самавызначэння.

На карэкцыйных занятках па пералічаных вышэй раздзелах у вучняў фарміруюцца таксама камунікатыўная кампетэнцыя і кампетэнцыя самапазнання. У каляндарна-тэматычным planаванні ў якасці самастойных раздзелаў яны не выдзяляюцца, але атрымліваюць адлюстраванне ў змесце і задачах карэкцыйных заняткаў.

5. На карэкцыйных занятках выкарыстоўваюцца групавыя, парныя і індывідуальныя формы арганізацыі дзейнасці вучняў. Іх выбар ажыццяўляецца з улікам задач і зместу тэмы карэкцыйных заняткаў.

На карэкцыйных занятках трэба максімальна шырока выкарыстоўваць інфармацыйна-камунікацыйныя тэхналогіі, мадэляванне і вырашэнне розных праблемных жыццёвых сітуацый, інсцэніроўкі, складанне алгарытмаў дзейнасці ў розных сітуацыях, дыдактычныя і дзелавыя гульні, «круглыя сталы», дыскусіі і іншыя метады, якія забяспечваюць актыўнасць вучняў, іх камунікатыўнае ўзаемадзеянне з настаўнікам-дэфектолагам і паміж сабой.

Камунікатыўная накіраванасць карэкцыйных заняткаў прадугледжвае ўзбагачэнне і актывізацыю слоўнікавага запасу, развіццё маўленчай ініцыятывы, фарміраванне ўменняў дыялагічнага і маналагічнага маўлення, развіццё яго граматычнага ладу,

фарміраванне ўменняў зносін у розных сітуацыях (у розных установах, з прадстаўнікамі розных службаў, з людзьмі рознага ўзросту, у рамках дзелавых і асабістых зносін) з захаваннем правіл маўленчага этыкету, самапрэзентацыі, камунікацыі ў глабальнай камп’ютарнай сетцы Інтэрнэт (далей – сетка Інтэрнэт).

Пры вызначэнні зместу і методыкі карэкцыйных заняткаў па сацыяльным арыентаванні трэба ўлічваць рэкамендацыі педагога-псіхолага, звязаныя з магчымымі праблемамі сацыяльнага ўзаемадзеяння і асобаснымі асаблівасцямі вучняў.

## ГЛАВА 2
## ЗМЕСТ ПРАГРАМЫ

Грамадзянска-прававая кампетэнцыя

Выяўленне ўзроўня валодання вучнямі грамадзянска-прававой кампетэнцыяй.

Замацаванне і пашырэнне ведаў пра:

асновы канстытуцыйнага ладу Рэспублікі Беларусь;

правы і абавязкі грамадзян;

правы і абавязкі вучняў;

нормы паводзін, паводзіны, якія караюцца грамадствам; правапарушэнні і злачынства як від правапарушэння;

адказнасць, у тым ліку адміністрацыйная адказнасць непаўналетніх і законных прадстаўнікоў, за правапарушэнні і ў тым ліку злачынствы;

дакументы грамадзяніна Рэспублікі Беларусь (пасведчанне аб нараджэнні, пашпарт грамадзяніна Рэспублікі Беларусь, дакументы аб адукацыі, іншыя дакументы), правілы іх захоўвання і прад’яўлення;

абарону праў спажыўцоў і спосабы рэалізацыі гэтых праў;

дагаворы на выкананне паслуг, выкананне ўласных абавязацельстваў у адпаведнасці з дагаворам;

віды і ўмовы страхавання; банкаўскую сістэму і яе паслугі для фізічных асоб;

правілы выезду за мяжу (атрыманне візы, страхаванне і іншае).

Фарміруемыя ўменні:

актуалізаваць грамадзянска-прававыя веды для аналізу розных сацыяльных сітуацый і вызначэння дзеянняў пры іх узнікненні;

арыентавацца ў мерапрыемствах грамадзянска-прававой накіраванасці, якія праводзяцца ў адпаведнасці з Праграмай бесперапыннага выхавання дзяцей і навучэнскай моладзі на 2021–2025 гг., зацверджанай пастановай Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь ад 31 снежня 2020 г. № 312;

вызначаць і выконваць свае абавязкі (у працэсе дзелавой гульні, змадэляванай сітуацыі);

аналізаваць разнастайныя сітуацыі паводзін (могуць быць прадастаўлены ў мультымедыйным варыянце або ў апісанні у апісанні педагагічнага работніка) ва ўстанове адукацыі, у грамадскіх месцах, пры паездцы на транспарце;

аналізаваць разнастайныя выпадкі здзяйснення правапарушэнняў, у тым ліку злачынстваў і адказнасці за іх;

даваць ацэнку супрацьпраўным паводзінам іншых людзей, паведамляць аб здарэннях (дарожна-транспартных і іншых), правапарушэннях, у тым ліку злачынствах;

выконваць пошук інфармацыі пра паслугі розных устаноў і арганізацый;

звяртацца з заявай для ажыццяўлення звароту ці замены няякаснага тавару, у выпадках няякаснага аказання паслуг;

патрабаваць выканання дагаворных абавязацельстваў;

складаць заявы ў выпадках згубы рэчаў, дакументаў, крадзяжу асабістай маёмасці і іншае;

звяртацца за атрыманнем дакументаў, неабходных для выезду за мяжу, выконваць іх запаўненне.

Кампетэнцыя здароўезберажэння

Выяўленне ўзроўня увалодання вучнямі кампетэнцыяй здароўезберажэння.

Замацаванне і пашырэнне ведаў:

аб дзяржаўных установах аховы здароўя (паліклініка, бальніца), аб платных медыцынскіх паслугах;

аб спецыяльнасцях урача (урач-тэрапеўт, урач-педыятр, урач-отарыналарынголаг, урач-афтальмолаг, урач-акушэр-гінеколаг (для дзяўчынак), урач-кардыёлаг, урач-хірург і іншае);

аб арганізацыі работы аптэчных арганізацый;

лекавых сродкаў і лекавых прэпаратаў, правілах іх набыцця і захоўвання, тэрмінах прыдатнасці, шкодзе самалячэння;

аб ахове зроку;

пра спосабы прафілактыкі гельмінтозу ў чалавека;

пра шкоду курэння, ужывання алкаголю і наркатычных сродкаў;

аб значэнні харчавання для жыцця і здароўя чалавека, асноўных прадуктах харчавання расліннага (хлебапрадукты, гароднiна, садавіна) і жывёльнага (мясныя, рыбныя, малочныя, яйкі) паходжання, аб агульных санітарна-эпідэміялагічных патрабаваннях да падрыхтоўкі і захоўванню ежы;

аб пажыўных рэчывах і іх утрыманні ў прадуктах харчавання, аб каларыйнасці прадуктаў харчавання, аб правілах здаровага харчавання;

аб прыкметах інтэлектуальнай стомы (зніжэнне ўвагі, тэмпу працы, павелічэння колькасці памылак);

аб небяспечных прыродных з’явах;

пра асабістую гігіену юнакоў (дзяўчат), гігіенічных сродках, касметычных сродках;

аб недатыкальнасці цела, нормах палавога і сэксуальнага паводзінаў, пазбяганні сэксуальных дамаганняў, пра спосабы этычнай абароны;

пра спосабы прафілактыкі захворванняў, якія перадаюцца палавым шляхам.

Фарміруемыя ўменні:

актуалізаваць веды ў галіне здароўезберажэння для аналізу розных сацыяльных сітуацый і вызначэння дзеянняў у іх;

звяртацца да медыцынскіх работнікаў установы адукацыі, выконваць выклік брыгады хуткай дапамогі, звяртацца ў паліклініку з улікам свайго стану і спецыяльнасці ўрача;

выкарыстоўваць сетку Інтэрнэт для замовы талона на прыём да ўрача;

атрымліваць праз сетку Інтэрнэт звесткі аб наяўнасці ў аптэках лекаў і лекавых прэпаратаў;

атрымліваць інфармацыю аб платных медыцынскіх паслугах, арыентавацца ў кошце і звяртацца за іх атрыманнем;

ацэньваць сітуацыі магчымага заражэнне гелмінтамі;

адказваць адмовай ад уцягвання ў курэнне, ужыванне алкаголю і наркатычных сродкаў (апісанне магчымай сітуацыі прапануецца педагагічным работнікам);

арыентавацца ва ўмовах захоўвання харчовых прадуктаў і ажыццяўляць іх выбар;

адрозніваць дабраякасныя і недабраякасныя прадукты харчавання па паху, вонкавым выглядзе, дадзеных аб тэрміне прыдатнасці;

вызначаць рэжым харчавання, рэкамендуемая колькасць прадуктаў харчавання;

складаць розныя варыянты меню на дзень, на тыдзень з улікам правілаў здаровага харчавання, разнастайнасці, каларыйнасці і спалучальнасці прадуктаў харчавання;

складаць і выконваць рацыянальны рэжым працы і адпачынку;

вызначаць меры па папярэджанні інтэлектуальнай стомы;

ацэньваць небяспечныя прыродныя з’явы (навальніца, лівень, галалёд, ураганны вецер і іншае) і выбіраць бяспечны спосаб паводзін пры іх надыходзе;

падбіраць гігіенічныя і касметычныя сродкі з улікам полу, узросту, часу сутак, пары года;

знаходзіць інфармацыю аб выкарыстанні гігіенічных сродкаў, касметычных сродкаў на іх упакоўцы і ў сетцы Інтэрнэт;

падбіраць гігіенічныя і касметычныя сродкі з улікам атрыманай інфармацыі;

арыентавацца ў спосабах папярэджання ад сэксуальных дамаганняў (пазбяганне сумніўных знаёмстваў і кампаній, асцярожнасць у кантактах з незнаёмымі людзьмі, адмова ад нявартых прапаноў і іншае).

Сямейна-бытавая кампетэнцыя

Выяўленне ўзроўня валодання вучнямі сямейна-бытавой кампетэнцыяй.

Замацаванне і пашырэнне ведаў:

аб членах сям'і, іх занятках і абавязках;

аб умовах заключэння шлюбу ў Рэспубліцы Беларусь;

аб магчымых прычынах распаду сям'і, аб поўнай і няпоўнай сям'і, аб адказнасці бацькоў за ўтрыманне і выхаванне дзяцей, аб дапамозе і падтрымцы пажылых сваякоў;

аб спосабах догляду бытавых прыбораў;

аб небяспечных для жыцця сітуацыях у побыце;

аб экстраных службах (міліцыя, падраздзяленні па надзвычайных сітуацыях, аварыйная служба газу і іншае);

аб кошце прадуктаў харчавання, прадметаў адзення і абутку, у тым ліку з улікам месца іх набыцця, магчымых акцый;

аб гарантыйных тэрмінах, магчымасці і ўмовах вяртання набытага адзення і абутку ва ўстаноўленыя тэрміны;

аб сямейным бюджэце, крыніцах яго фарміравання і яго расходаванні;

аб перыядычнасці і парадку аплаты за жыллёва-камунальныя паслугі;

аб магчымасці назапашвання зберажэнняў;

аб сямейных традыцыях (святах, звычаях, абрадах);

аб нормах зносін з суседзямі.

Фарміруемыя ўменні:

актуалізаваць веды пра сям'ю і побыт сям'і для аналізу розных сацыяльных сітуацый і вызначэння дзеянняў у іх; ацэньваць выкананне сваіх абавязкаў як члена сям'і (в аказанні даступнай дапамогі членам сям'і, якія маюць у ёй патрэбу, пастаянных і часовых гаспадарча-бытавых даручэннях і іншых абавязкаў);

планаваць сваю дзейнасць як члена сям'і (вызначаць паслядоўнасць і рацыянальна размяркоўваць час на выкананне абавязкаў у сям'і);

планаваць сямейныя святы і свой удзел у іх;

арыентавацца ў мерапрыемствах, прысвечаных Дню маці, Дню бацькі, Дню сям'і;

аналізаваць розныя праблемныя сітуацыі ў сям'і;

даглядаць за бытавымі прыборамі (халадзільнік, газавая і электрычная пліта) на аснове вывучэння інструкцый;

выконваць патрабаванні інструкцый па бяспечным выкарыстанні розных бытавых прыбораў;

знаходзіць патрэбнае рашэнне ў непрадбачаных, небяспечных і экстраных сітуацыях (згуба ключа, узгаранне, пах газу, прарыў трубы, няспраўнасці сістэмы водазабеспячэння і іншае);

здымаць паказанні лічыльнікаў і выкарыстоўваць іх пры аплаце жыллёва-камунальных паслуг;

планаваць выдаткі на харчаванне, аплату жыллёва-камунальных паслуг, сродкаў мабільнай сувязі членаў сям'і, куплю адзення і абутку, лекаў, на адукацыю, вольны час, аздараўленне, іншыя выдаткі;

удзельнічаць у планаванні расходавання сродкаў з бюджэту сям'і, уключаючы перыяд фінансавых абмежаванняў;

знаходзіць цікавыя рэцэпты новых страў, магчымасці патаннення харчавання;

арыентавацца ў сітуацыях зносін з суседзямі і ўзаемадзеяння з імі;

ацэньваць свае паводзіны ў розных сацыяльна-бытавых сітуацыях.

Сацыякультурная кампетэнцыя

Выяўленне ўзроўня валодання вучнямі сацыякультурнай кампетэнцыяй.
Замацаванне і пашырэнне ведаў:
аб вучнёўскім калектыве;
аб сістэме ўстаноў дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі;
аб суб’ектах гандлю, аб рынках;
аб аптовых і паўсядзённых пакупках;
пра паслугі суб’ектаў гандлю (звычайны продаж, продаж у крэдыт, з растэрміноўкай, праз сетку Інтэрнэт);
пра паслугі вакзалаў і аэрапортаў (даведачная, заказ і купля квіткоў);
аб банках і банкаўскіх паслугах, наяўных і безнаяўных грошах, выкарыстанні банкаўскай плацежнай карткі;
аб правілах атрымання грошай, разлікаў у краме з дапамогай банкаўскай плацежнай карткі;
аб магчымасцях і правілах зносін у сетцы Інтэрнэт, аб бяспецы ў сетцы Інтэрнэт; ў галіне фінансавай пісьменнасці (паняцці «страхаванне», «падатак», «крэдыт»);
нормах зносін і стылях зносін (афіцыйны, сяброўскі).

Фарміруемыя ўменні:
актуалізаваць веды аб установах адукацыі і арганізацыях аховы здароўя, аб’ектах сацыяльнага абслугоўвання, гандлёвых аб’ектах, аб выкананні розных сацыяльных роляў для аналізу розных сацыяльных сітуацый і вызначэння дзеянняў у іх;
разумець сваё становішча ў вучнёўскім калектыве;
арыентавацца ў сістэме ўстаноў дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі, паслугах фізкультурна-аздараўленчых і спартыўных цэнтраў, у магчымасцях выкарыстання фізультурна-спартыўныя збудаванняў;
планаваць свой адпачынак;
арыентавацца ў сімвалах на ўпакоўцы розных тавараў;
арыентавацца ў спосабах набыцця тавараў і атрымання паслуг суб’ектаў гандлю, аплаты тавараў і паслуг;
ажыццяўляць заказ харчовых і нехарчовых тавараў праз інтэрнэт-крамы (з улікам магчымых рызык і абароны правоў спажыўца);
арыентавацца ў выкарыстанні паслуг вакзалаў і аэрапортаў (даведачнай, замовы і куплі білетаў), атрыманні дадатковай інфармацыі, вырашэнні праблемных сітуацый (у рамках дзелавых гульняў);
карыстацца паслугамі банка (у рамках дзелавых гульняў);
арыентавацца ў сваіх фінансавых магчымасцях пры набыцці тавараў у крэдыт і атрыманні крэдыту;
выбіраць стыль зносін;
ацэньваць зносіны іншых людзей і сваё ў розных сітуацыях.

Кампетэнцыя прафесійнага самавызначэння

Выяўленне ўзроўня валодання вучнямі кампетэнцыяй прафесійнага самавызначэння.
Замацаванне і пашырэнне ведаў:
аб галінах прамысловасці;
аб рабочых прафесіях, агульных для ўсіх галін эканомікі;
аб патрабаваннях прафесіі да чалавека (здароўю, прафесійнай кваліфікацыі, прафесійным здольнасцям);
аб установах адукацыі, якія рэалізуюць адукацыйныя праграмы прафесійна-тэхнічнай, сярэдняй спецыяльнай, вышэйшай адукацыі;
аб магчымасці працягу адукацыі на ўзроўнях прафесійна-тэхнічнай адукацыі і сярэдняй спецыяльнай адукацыі па завяршэнні навучання і выхавання на II ступені агульнай сярэдняй адукацыі;

аб магчымасці працягу адукацыі на ўзроўнях прафесійна-тэхнічнай адукацыі, сярэдняй спецыяльнай адукацыі і вышэйшай адукацыі па завяршэнні навучання і выхавання на III ступені агульнай сярэдняй адукацыі;

аб канкрэтных умовах атрымання прафесій на ўзроўнях прафесійна-тэхнічнай, сярэдняй спецыяльнай і вышэйшай адукацыі;

аб шляхах атрымання інфармацыі, неабходнай для прыняцця рашэння аб выбары прафесіі і шляхах яе атрымання;

аб тэрытарыяльных цэнтрах сацыяльнага абслугоўвання і занятасці насельніцтва.

Фарміруемыя ўменні:

арыентавацца ў патрабаваннях прафесіі да чалавека;

выконваць пошук і апрацоўку прафесійнай інфармацыі ў друкаваных сродках масавай інфармацыі і ў сетцы Інтэрнэт (змест розных прафесій, патрабаванні да адукацыі, попыт на рынку працы, умовы і аплата працы і іншае);

аналізаваць прафесійную інфармацыю, атрыманую з розных крыніц (тэлебачанне, друкаваныя сродкі масавай інфармацыі, сетка Інтэрнэт, іншыя крыніцы);

ажыццяўляць адбор інфармацыі, значнай для прыняцця рашэння аб выбары прафесіі;

актуалізаваць веды, неабходныя для прыняцця рашэння аб выбары прафесіі і шляхах яе атрымання;

арыентавацца ва ўстановах адукацыі, якія рэалізуюць адукацыйныя праграмы прафесійна-тэхнічнай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі свайго рэгіёна (адрозніваць па ўзроўнях адукацыі, вызначаць магчымасці атрымання канкрэтных прафесій, умовы прыёму, тэрміны і ўмовы навучання, забеспячэння працаўладкавання выпускнікоў);

арыентавацца і карыстацца паслугамі тэрытарыяльных цэнтраў сацыяльнага абслугоўвання і занятасці насельніцтва;

аналізаваць розныя варыянты працягу вучобы і атрымання прафесіі.

Чаканыя вынікі

Навучэнцы ўмеюць:

рэалізоўваць правы і выконваць абавязкі грамадзяніна Рэспублікі Беларусь;

арыентавацца ў мерапрыемствах грамадзянска-прававой накіраванасці;

выконваць сацыяльныя нормы і патрабаванні да правіл паводзін;

пазітыўна і адказна ставіцца да свайго здароўя;

арганізоўваць свай вольны час;

арыентавацца ў сістэме сямейных адносін і выконваць свае абавязкі члена сям’і;

арыентавацца ў розных сацыяльных ролях;

рэалізоўваць розныя сацыяльныя ролі (сын, дачка, сястра, брат, унук, унучка, пляменнік, пляменніца);

арыентавацца ў суб’ектах гандлю, дзяржаўных установах аховы здароўя, экстраных службах, карыстацца іх паслугамі;

аб’ектыўна ацэньваць свае паводзіны і паводзіны іншых людзей у розных сітуацыях;

выкарыстоўваць атрыманую эканамічную падрыхтоўку ў розных жыццёвых сітуацыях;

арыентавацца ў інфармацыі аб прафесіях і шляхах іх атрымання, падыходзіць да выбару прафесіі і яе атрымання з улікам сваіх інтарэсаў, магчымасцяў і стану рынку працы;

ажыццяўляць пошук інфармацыі ў розных крыніцах;

усведамляць свае магчымасці і ажыццяўляць адэкватны выбар сродкаў для прэзентацыі ўласных дасягненняў у розных галінах;

уступаць у вусныя зносіны з навакольнымі людзьмі ў розных сітуацыях;

выкарыстоўваць сродкі вуснай і пісьмовай камунікацыі.